✓ **27 красавіка ў галерэі «Мабільная» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі** адкрылася выстава **«Прысвячэнне майстру»,** прымеркаваная да 120-годдзя з дня нараджэння народнага мастака Беларусі Івана Ахрэмчыка (1903 – 1971). На ёй прадстаўлены жывапісныя і графічныя працы вучняў Гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка 1970-х – 2020-х гг. У экспазіцыі дэманструюцца курсавыя і дыпломныя работы студэнтаў, прысвечаныя самым разнастайным тэмам, – навучанню, пошуку прызначэння, успрыняццю рэчаіснасці, жыццю, гісторыі і культуры Беларусі.

Крок за крокам колькі дзесяцігоддзяў выдатныя беларускія мастакі, настаўнікі гімназіі-каледжа вучаць маладыя таленты асновам выяўленчага мастацтва, кіруючыся прыкладам Івана Ахрэмчыка. Іван Восіпавіч – знакавая асоба для беларускай мастацкай адукацыі, прафесар, выкладчык, настаўнік выдатных мастакоў. Менавіта ён настойваў на стварэнні прафесійнай школы жывапісу – і ў 1962 годзе Рэспубліканская школа-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве была адкрыта, а ў 2005-м перайменавана ў Гімназію-каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка. Іван Восіпавіч, яго вучні і наступнікі падрыхтавалі не адно пакаленне мастакоў. Дзякуючы ім адораныя дзеці з усіх куткоў Беларусі робяць свае першыя крокі ў творчасці.

Выстава будзе працаваць да 10 верасня.

*Скарыстаная інфармацыя*